# З практыкі партыйнай работы

## Праверка выканання — аснова бальшавіцкага стылю кіраўніцтва

*С. Прытыцкі,*
*першы сакратар Маладзечанскага абкома КП Беларусі*

Паспяховае ажыццяўленне задач разгорнутага камуністычнага будаўніцтва патрабуе далейшага ўдасканалення дзейнасці мясцовых партыйных арганізацый, асабліва ўзмацнення арганізатарскай работы ў масах. Важнейшай умовай, якая забяспечвае павышэнне ўзроўню арганізатарскай і палітычнай работы, з'яўляецца правільны падбор кадраў і добра пастаўленая праверка выканання. Неабходна дабівацца таго, каб на ўсіх участках працавалі людзі адукаваныя, ініцыятыўныя, якія валодаюць пачуццём новага, здольны арганізаваць і павесці масы на выкананне пастаўленых задач. Але нават самыя добрыя работнікі маюць патрэбу ў дапамозе, у дзелавой парадзе і кантролі з боку партыйнай арганізацыі, усёй грамадскасці. Выступаючы на пасяджэнні камуністычнай фракцыі Усерасійскага з'езда металістаў 6 сакавіка 1922 года, У. І. Ленін гаварыў: *«Правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананне справы* — у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым цяпер аснова ўсёй работы, усёй палітыкі» (Творы, т. 33, стар. 200).

Ленінскае ўказанне захоўвае сваю сілу і ў наш час. Праверка выканання ляжыць у аснове бальшавіцкага стылю кіраўніцтва. Як падкрэсліў чэрвеньскі Пленум ЦК КПСС, галоўнае цяпер у дзейнасці партыйных арганізацый — арганізатарская работа па практычнаму ажыццяўленню планаў, намечаных XXI з'ездам партыі. Пленум заклікаў узмацніць праверку выканання рашэнняў партыі і ўрада, паставіць яе ў цэнтр увагі ўсіх партыйных арганізацый. «Баявая арганізатарская работа, кантроль за выкананнем прынятых рашэнняў, — гаворыць таварыш М. С. Хрушчоў, — вось што вырашае цяпер поспех выканання сямігадовага плана».

Цэнтральны Камітэт КПСС прызнаў мэтазгодным утварыць у пярвічных партарганізацыях вытворчых і гандлёвых прадпрыемстваў камісіі па кантролю дзейнасці адміністрацыі. Гэтая новая арганізацыйная форма партыйнага кантролю будзе садзейнічаць паляпшэнню работы прадпрыемстваў прамысловасці і транспарту, будоўляў і гандлю, забяспечыць удзел у кантролі шырокіх партыйных і беспартыйных мас.

У партыйных арганізацыях нашай вобласці працуе ўжо больш ста такіх камісій. У іх склад увайшлі члены і кандыдаты ў члены КПСС — перадавыя рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі. Пры стварэнні камісій партыйныя арганізацыі зыходзілі з канкрэтных задач, якія стаяць перад тым ці іншым калектывам. На большасці прадпрыемстваў утвораны камісіі па кантролю за ўкараненнем новай тэхнікі, комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, за павышэннем якасці і зніжэннем

сабекошту выпускаемай прадукцыі. Іх актыўная дзейнасць дае станоўчыя вынікі.

Камісія па кантролю за выкананнем плана ўкаранення новай тэхнікі на Маладзечанскай гарадской электрастанцыі, якую ўзначальвае тав. Жараў, пачала сваю работу з вывучэння стану механізацыі ў кацельным цэху. Камуністы выявілі каштоўнае абсталяванне, завезенае сюды яшчэ ў кастрычніку мінулага года, якое не выкарыстоўваецца. Пытанне аб гэтым было пастаўлена перад адміністрацыяй. Дырэкцыя электрастанцыі разгледзела прапановы камісіі і прыняла меры да выкарыстання абсталявання. У цэху заканчваецца ўстаноўка двух рэгулятараў сілкавання катлоў, што дазволіць сэканоміць у год каля 30 тысяч рублёў і выслабаніць 5 рабочых для выкарыстання на іншых участках вытворчасці.

У вагонным дэпо станцыі Маладзечна транспарціроўка колавых пар да апошняга часу праводзілася ўручную. Камісія партыйнай арганізацыі, параіўшыся з перадавікамі вытворчасці, прапанавала механізаваць гэтую аперацыю. Калектыў колавага цэха ўласнымі сіламі ўжо зманціраваў маторную цялежку, якая замяніла малапрадукцыйную ручную працу.

Актыўна ўзяліся за справу таксама камісіі па кантролю ў партыйных арганізацыях Смаргонскага райпрамкамбіната. Вілейскага завода будаўнічых дэталей і многіх іншых. Яны ўцягваюць у барацьбу за выкананне дзяржаўных планаў шырокія масы працоўных, выхоўваюць у іх пачуццё непрымірымасці да недахопаў, дапамагаюць хутчэй вырашаць наспеўшыя пытанні вытворчасці.

Але няправільна было б думаць, што са стварэннем камісій трацяць сваё значэнне такія формы грамадскага кантролю, як справаздачы гаспадарчых кіраўнікоў на партыйных сходах, пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады, рабселькораўскія рэйды, камсамольскія пасты і г. д. Наадварот, партыйныя арганізацыі абавязаны забяспечыць адзінства і ўзгодненасць дзеянняў паміж рознымі формамі партыйнага і грамадскага кантролю, не дапускаючы пры гэтым празмернага нагрувашчвання праверак.

Партыя вучыць, што правяраць выкананне — значыць перш за ўсё арганізоўваць справу, дабівацца ліквідацыі недахопаў, падцягваць адстаючыя ўчасткі да ўзроўню перадавых. У цяперашні час абком, гаркомы і райкомы КПБ галоўную сваю ўвагу накіроўваюць на тое, каб яшчэ вышэй узняць узровень усёй арганізатарскай і палітычнай работы сярод людзей, на гэтай аснове забяспечыць безумоўнае выкананне ўзятых на 1959 год абавязацельстваў і заданняў сямігадовага плана кожным прадпрыемствам, калгасам, саўгасам.

З практыкі нашай работы можна прывесці многа прыкладаў, калі рашэнні, узятыя абкомам КПБ пад неаслабны кантроль, ажыццяўляюцца, што дае добрыя вынікі. Так, калгасы Ашмянскага раёна тры гады назад атрымлівалі нізкія ўраджаі сельскагаспадарчых культур, невысокай была і прадуктыўнасць грамадскай жывёлагадоўлі. У жніўні 1956 года пытанне аб кіраўніцтве Ашмянскага райкома КПБ сельскай гаспадаркай абмяркоўвалася на бюро ЦК КП Беларусі. Адзначалася, што раённы камітэт партыі і выканком райсавета дэпутатаў працоўных слаба займаліся падборам, расстаноўкай і выхаваннем кіруючых кадраў, не ўнікалі глыбока ў эканоміку калгасаў, мала клапаціліся аб укараненні ў сельскагаспадарчую вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту. У пастанове бюро ЦК КПБ былі намечаны меры па пераадоленню адставання раёна.

Абком КПБ дапамог раённай партыйнай арганізацыі ажыццявіць рашэнне ЦК. Праз два месяцы мы праверылі, як ажыццяўляліся намечаныя мерапрыемствы. У раёне пабывалі многія работнікі абкома і аблвыканкома. Яны дапамаглі дэталёва разабрацца ў справах кожнай сельгасарцелі, прыняць меры па іх арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню. Мы аказалі раёну канкрэтную дапамогу ў правядзенні землеўпарадкавання, завозе гатунковага насення, набыцці пароднай жывёлы, мінеральных угнаенняў і сельскагаспадарчай тэхнікі. Дзевяць чалавек з партыйна-савецкага актыву вобласці і раёна былі рэкамендаваны на работу старшынямі адстаючых арцелей. Многае было зроблена па паляпшэнню арганізацыі і ўпарадкаванню аплаты працы, ажыццяўленню пабрыгаднага прынцыпу размеркавання даходаў з улікам выхаду прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. Наладзілі сістэматычную вучобу старшынь праўленняў, брыгадзіраў паляводчых брыгад, загадчыкаў жывёлагадоўчых ферм.

Настойлівая барацьба за ажыццяўленне намечаных мерапрыемстваў дазволіла палепшыць справы, раён хутка ідзе ўгару. Рэзка зменшылася колькасць эканамічна слабых арцелей, павысілася ўраджайнасць збожжавых, узрасла прадуктыўнасць грамадскай жывёлагадоўлі. У 1958 годзе на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў у Ашмянскім раёне было атрымана па 94,3 цэнтнера малака, або амаль у 3 разы больш, чым у 1956 годзе, і 20,7 цэнтнера мяса. Грашовыя даходы калгасаў павялічыліся на 12 мільёнаў рублёў. Яшчэ больш высокія паказчыкі дасягнуты ў гэтым годзе. За восем месяцаў валавая вытворчасць малака ў калгасах і саўгасах раёна павялічылася на 30 працэнтаў, а мяса — на 44 працэнты ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года.

Выконваючы рашэнні верасднёўскага Пленума ЦК КПСС (1953 г.), мы прышлі да вываду, што высокадаходнай культурай у нашых умовах можа стаць лён. Абком партыі прыняў спецыяльную пастанову аб расшырэнні пасеваў ільну і рэзкім уздыме яго ўраджайнасці. Некаторыя кіруючыя таварышы і спецыялісты сельскай гаспадаркі скептычна аднесліся да гэтага, запэўнівалі, што ў такіх раёнах, як Крывіцкі, Вілейскі, Івянецкі і іншыя, лён не будзе расці. Але гэтыя сцвярджэнні былі негрунтоўнымі, неўзабаве жыццё іх абвергла. Абласная партыйная арганізацыя правяла вялікую работу па выкананню рашэння абкома. Была ўкаранёна звеннявая сістэма працы, людзей навучылі перадавым прыёмам вырошчвання ільну, стварылі матэрыяльную зацікаўленасць калгаснікаў у выніках працы. Пасяўныя плошчы ільну ў калгасах вобласці расшыраны больш чым у два разы. Лён з'явіўся важнай крыніцай росту грашовых даходаў, умацавання эканомікі сельгасарцелей і павышэння матэрыяльнага дабрабыту калгаснікаў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі